Брно, 15 лістапада 2020 г.

# Лісты палітычным вязням у Беларусі

**Цэнтр эксперыментальнага тэатра ў Брне ў супрацоўніцтве з Амбасадай незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы з нагоды свята 17 лістапада распачынаюць праект, у рамках якога вядомыя дзеячы чэшскага культурнага і грамадскага жыцця пішуць прыватныя лісты беларускім палітычным вязням.**

Цэнтр эксперыментальнага тэатра (ЦЭТ) і Амбасада незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы пастанавілі ўшанаваць сёлетнія ўгодкі Аксамітнай рэвалюцыі, непасрэдна звярнуўшыся да актуальных падзей у свеце і сучасных праблем. Вынікам гэтай ідэі сталася ініцыяванне прыватных лістоў беларускім палітычным вязням.

Гэтай ініцыятывай ЦЭТ хоча прыпомніць запавет Вацлава Гаўла, які заўсёды аддаваў свой талент і сілы на падтрыманне падставовых правоў і свабод чалавека, не зважаючы, ці гэтыя правы парушаюцца ў нашай краіне або недзе яшчэ ў свеце. Этас 17 лістапада падаецца ініцыятарам прыдатнай падставай дзеля пачатку гэтага праекта.

Грамадзяне Беларусі ўжо некалькі месяцаў настойліва змагаюцца за справядлівыя выбары і свабоду. “Нам падаецца слушным і надзвычай важным на поўны голас прыцягваць увагу чэшскай і ўсясветнай грамадскасці да таго, што Беларусь і аўтарытарны рэжым Лукашэнкі дзейнічае несправядліва і ўціскае падставовыя правы чалавека. Людзей у Беларусі за мірнае і негвалтоўнае выказванне свайго меркавання затрымліваюць, арыштоўваюць, збіваюць, запалохваюць і інакш рэпрэсуюць. Гэта недапушчальна і мы рашуча адмаўляемся прымаць такія дзеянні”, – тлумачыць дырэктар ЦЭТ Міраслаў Ошчатка.

Амбасадар незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы Сяргей Сматрычэнка дадае: “З тысяч людзей, якія ў Беларусі былі затрыманыя ці ўвязненыя ў сувязі з пратэстамі супраць нелегітымных выбараў прэзідэнта ў 2020 г., мы выбралі адзінаццаць асобаў, якіх хочам падбадзёрыць і даць ім сігнал, што іх намаганні і лёс нам не абыякавыя. Таму мы звярнуліся да вядомых чэшскіх (і не толькі) дзеячоў грамадскага і культурнага жыцця, каб яны напісалі беларускім вязням ліст”.

Centre for Experimental Theatre
Zelný trh 9, 602 00 Brno, Czech Republic; www.ced-brno.cz
TAX ID: CZ00400921, Company registration number: 00400921

ced

centre for experimental theatre brno

Форму прыватных лістоў Цэнтр эксперыментальнага тэатра лічыць прыдатнай яшчэ і з увагі на крызіснае становішча і забарону сходаў, якія ў Чэхіі былі абвешчаны ў сувязі з пашырэннем эпідэміі каранавірусу.

Заклік Цэнтра эксперыментальнага тэатра і Амбасады незалежнай беларускай культуры прынялі:



**Сямён Бычкоў**
галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік Чэшскай філармоніі

**Радка Дэнэмаркава**
пісьменніца і перакладчыца

**Фэдар Гал**
славацкі палітык і сацыёлаг, сузаснавальнік і пазнейшы старшыня руху Грамадскасць супраць гвалту

**Вацлаў Малы**
дапаможны пражскі біскуп, сузаснавальнік Камітэта абароны несправядліва пераследаваных

**Моніка Макдона Паерава**
спікерка студэнцкага страйку ў 1989 г., дыпламатка і выкладчыца

**Павел Рыхецкі**
старшыня Канстытуцыйнага суда Чэшскай Рэспублікі



**Вольга Сомэрава**
рэжысёрка-дакументалістка

**Эрык Табэры**
журналіст і публіцыст, галоўны рэдактар часопіса “Respekt”

**Катэржына Тучкава**
пісьменніца, публіцыстка, мастацкая куратарка

**Мілаш Выстрчыл**
старшыня Сената Парламента Чэшскай Рэспублікі

**Міхаэл Жантаўскі**
дыпламат, перакладчык, адзін з заснавальнікаў Грамадскага форуму і яго прэс-сакратар, дырэктар Бібліятэкі Вацлава Гаўла

Лісты былі напісаныя па-чэшску і перакладзеныя на беларускую і англійскую мовы. Акрамя публікацыі ў СМІ, гэтыя лісты дасланыя ўсім адрасатам у беларускія турмы.

Усім людзям, якія цяпер у Беларусі патрабуюць прызначэнне справядлівых выбараў і якія дамагаюцца свабоды і дэмакратыі, гэтым актам ЦЭТ выказвае сваё захапленне і падтрымку.

https://www.facebook.com/anbelkult
www.ced-brno.cz

Кантакт


Міраслаў Ошчатка
дырэктар ЦЭТ

m.: +420 739 471 650
t.: +420 542 123 426
oscatka@ced-brno.cz

Zelný trh 9, 602 00 Brno
Czech Republic












**Сямён Бычкоў (нар. 1952)**
галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік Чэшскай філармоніі.

Нарадзіўся ў Пецярбурзе, тады яшчэ Ленінградзе, адкуль у 1974 г. эміграваў у Аўстрыю, а потым у ЗША, дзе ў 1983 г. атрымаў амерыканскае грамадзянства.

Акрамя іншага, у 1985-89 гг. быў музычным дырэктарам філарманічнага аркестра Бафала, а ў 1997-2010 гг. у якасці галоўнага дырыжора кіраваў Сімфанічным аркестрам WDR у Кёльне. У кастрычніку 2017 г. быў прызначаны галоўным дырыжорам і музычным дырэктарам Чэшскай філармоніі на 5 гадоў пачынаючы з сезона 2018/2019.

## Сямён Бычкоў

→

## Мікалай Статкевіч



**Мікалай Статкевіч (нар. 1956)**
палітык, лідар сацыял-дэмакратычнай Народнай грамады.

Падпалкоўнік запасу, а ў 90-я гады – адзін з заснавальнікаў Беларускага згуртавання вайскоўцаў. Доктар тэхнічных навук. Адзін з найбольш вядомых апанентаў Лукашэнкавага рэжыму, у 2010 г. быў адным з прэзідэнцкіх кандыдатаў. Пачынаючы з 2004 г. правёў у турмах агулам болей за 6 гадоў. Апошні раз арыштаваны ў траўні 2020 г. дарогай на перадвыбарчы мітынг Святланы Ціханоўскай і пасля некалькіх 15-сутачных тэрмінаў быў абвінавачаны ў арганізацыі масавых хваляванняў.

Шаноўны спадар Статкевіч!

Штогод 17 лістапада народ Чэхіі адзначае ўгодкі Аксамітнай рэвалюцыі 1989 года. Мы заўсёды асацыюем рэвалюцыю з кровапраліццём, якое часта вядзе да грамадзянскай вайны, што на псіхіцы народа пакідае незагойныя раны, якія смыляць яшчэ шмат стагоддзяў пасля.
Але тое, што адбылося ў Чэхіі ў 1989 годзе, паказала нам, што змена, якой людзі прагнуць, можа настаць і без трагедыі, якою бывае вайна.
Гэта візія, якую Вы і Вашы калегі спрабуеце ўмагчыміць і беларускаму народу. Ваша адвага твар у твар гвалтоўнаму задушэнню рэжымам мірных пратэстаў, выкліканых неймавернай фальсіфікацыяй выбарчых вынікаў, Ваша годнасць пры абароне самага падставовага права кожнага грамадзяніна быць чутым і паважаным, спеласць пераважнай часткі беларускага грамадства, якое адмаўляецца верыць афіцыйным дэкларацыям, што астатнія краіны вырашылі выклікаць у Беларусі канстытуцыйны крызіс, усё гэта сталася крыніцай натхнення для мільёнаў людзей ва ўсім свеце, якія вераць, што кожны народ мае права вызначаць, як хоча жыць і хто ім мае кіраваць. Кожны рэжым, які адмаўляецца прызнаць гэтае падставовае права, асуджаны на падзенне, як толькі прыйдзе яго час, так як паў Берлінскі мур. Пытаннем застаецца, калі і як гэта адбудзецца. Цяпер перад Беларуссю паўсталі гэтыя пытанні і на іх трэба шукаць адказы. Кожны народ мусіць знайсці сваё ўласнае рашэнне і свой уласны шлях для яго ажыццяўлення. Гісторыя – наш адзіны настаўнік. Нічога, што адбываецца ў сучаснасці, не існуе без прэцэдэнту. Адным з законаў гісторыі ёсць непазбежнасць змены. Чым больш рэжым жорсткі, тым бліжэй і непазбежней яго падзенне. Прыйдзе момант, калі людзі перастануць трываць свае пакуты. Менавіта гэта мы бачым цяпер у Беларусі. А таксама мы бачым, як характар беларускага народа дыктуе людзям абіраць мірны шлях для дасягнення свабоды. Сапраўды вельмі ўражвае бачыць дэманстрантаў, якія дзень пры дні, насуперак суроваму гвалту, арыштам, пагрозам і бясконцай мане афіцыйнай рэжымнай прапаганды выходзяць, каб паказаць, у чым перакананыя. Нягледзячы ні на што, людзі працягваюць змагацца і прымаюць свае страты.
Ані мне, ані нікому іншаму, хто жыве за мяжой, не належыць раіць Вам наконт таго, як ажыццявіць Вашу мару пра справядлівае і сумленнае грамадства, бо гэта Вашыя жыцці знаходзяцца пад пастаяннай пагрозай. Тым не менш, я быў бы рады, каб Вы ведалі, што Вашыя ўяўленні рэзануюць не толькі з маім сэрцам, але і з сэрцамі мільёнаў людзей з усяго свету. Мы захапляемся Вамі за адвагу, з якой Вы бароніце каштоўнасці, у якія верыце, і з якой ідзяце за сваімі ажыццяўленнем сваіх візій, чаго б гэта ні каштавала.
Ваша ўласнае жыццё, шаноўны спадар Статкевіч, тыя ахвяры, якія Вы і Ваша сям’я прыносіце ў змаганні за шляхетную мару, ёсць сведчаннем сілв і красы чалавечай душы, якую нічога і ніхто не можа зламаць.

Зычу Вам поспеху.

Зычу Вам і Вашаму народу, каб поспех быў дасягнуты без людскіх стратаў.

Зычу Вам і надалей быць для свету прыкладам таго, як рэалізаваць змену мірным шляхам.

Сямён Бычкоў
Мастацкі дырэктар і галоўны дырыжор Чэшскай філармоніі

## Радка Дэнэмаркава (нар. 1968)
пісьменніца, перакладчыца, сцэнарыстка.



Вывучала багемістыку і германістыку на філасофскім факультэце Карлавага ўніверсітэта, дзе ў 1997 г. абараніла і дысертацыю. Затым працавала навуковай супрацоўніцай Інстытута чэшскай літаратуры АН Чэхіі, а таксама загадчыцай літаратурнай часткі ў “Тэатры На парэнчах” (Divadlo Na Zábradlí). З 2004 г. пісьменніца на вольных хлябах.
Аўтарка манаграфіі пра тэатральнага і кінарэжысёра Эвальда Шорма “Сам сабе вораг” (1998), рамана “Грошы ад Гітлера” (2006), раманнай манаграфіі “Смерць, ты не будзеш баяцца” (2008) і многіх іншых.

Творы Радкі Дэнэмаркавай дагэтуль былі перакладзены на 23 мовы, яна адзіна чэшская аўтарка, якая чатыры разы атрымала прэстыжную літаратурную прэмію “Magnesia Litera” – за прозу, за публіцыстыку, за пераклад і галоўны прыз “Кніга года 2019”.

# Радка Дэнэмаркава

→

# Сяргей Ціханоўскі




## Сяргей Ціханоўскі (нар. 1978)
відэаблогер і прадпрымальнік.

Яго канал на YouTube “Страна для жизни”, на якім ён паказваў і выкрываў бюракратычную сваволю і карупцыю, бяспраўе звычайных беларусаў, зрабіўся вельмі папулярным, што дадало Ціханоўскаму рашучасці кандыдаваць на прэзідэнта. Тым не менш, ён не быў зарэгістраваны ЦВК, бо нібыта меўся падаць заяву сам, прытым што рэжым узяў яго ў той час пад арышт. У выніку заяўку на рэгістрацыю падала яго жонка Святлана. Пазней падчас збору подпісаў за жонку, Ціханоўскі, дзякуючы правакацыі спецслужбаў, быў зноў арыштаваны і абвінавачаны ў грубым парушэнні грамадскага парадку і чыненні перашкодаў пры рэалізацыі выбарчага права. З жонкай Святланай у Сяргея Ціханоўскага двое дзяцей.

Дарагі Сяргей Ціханоўскі!

Для мяне Вы жывы партрэт упартасці і годнасці. Тое, што яшчэ ўчора немагчыма было ўявіць і дапусціць, за кароткі час сталася рэальнасцю. Гуманнасць і правы чалавека, свабода і прававая дзяржава ў Беларусі атакуюцца і надломваюцца даўно. Гэта атака на нас усіх.

Калі дэмакратыя адмірае, то сантыметр за сантыметрам. Еўропа рвецца і крышыцца, замест таго, каб трымацца разам; яна забыла словы Андрэ Глюксмана, што шлях да дэмакратыі вельмі складаны. Ён выбрукаваны бітвамі, а таксама пэўнаю салідарнасцю, пра якую часта забываюць.

Гісторыя перагортвае новыя старонкі. Яна піша іх новаю мовай. Плошчы 1989 года ва Усходняй Еўропе гаварылі пра дэмакратыю, свабодныя выбары, творчую свабоду. Мінула трыццаць гадоў, улада Беларусі адпрэчвае свабодныя выбары і зрабілася брутальнай паліцэйскай дзяржавай. У часы неалібералізму многія хутка забываюць такія паняцці, як правы чалавека, дэмакратыя, свабода поглядаў, і ім нават цалкам абыякава, што цэнзуруецца інтэрнэт. Аляксандр Лукашэнка не збіраецца цярпець ніякага зруху да сапраўднай дэмакратыі, якой ён вельмі баіцца. Палітыкі яго тыпу асепленыя Расіяй і Кітаем, яны бачаць, што сапраўды можна рабіць і інакш. Можна карыстацца выгадамі капіталізму, нават не рызыкуючы ўвядзеннем дэмакратыі.

Гаворка пра самапрэзентаванне і высакамернасць улады. Улада зноў раскрывае свой намер: зуніфікаваць жыццё, вырваць з яго ўсё, што неяк вытыркаецца, усё незалежнае. Але існуе і іншы палітычны стыль. Супрацьлегласць Лукашэнкаў, Трампаў, Пуцінаў, Сі Цзіньпінаў, Орбанаў, Эрдаганаў, Бабішаў, Зэманаў, Качыньскіх... Вы і Святлана Ціханоўская мяняеце спосаб, якім людзі разважаюць пра палітыку і дэмакратыю. Толькі аўтэнтычныя асобы здольныя ў крызіс з’яднаць і пераканаць людзей. Палітыка значыць адказнасць. Гэта супрацьлегласць да алігархаў і палітыкаў “трампаўскага” фасону, якія свет імкнуцца ўводзіць у зман з дапамогай сацыяльных сетак. Быць аўтэнтычным значыць, іншымі словамі, жыць сваё жыццё ў праўдзе.

У Беларусі людзі адважна пратэстуюць супраць вяртання да таталітарызму. Яны паўсталі супраць сваёй ролі бяспраўнай дэтанькі дыктатаравага механізму. Знайшлі ў сабе глыбейшую адказнасць за свет і за сваё месца ў ім. Змаганне за свабоду і свабоднае крытычнае мысленне ва ўсе часы цяжкае і не мае канца. Не толькі ўсходнееўрапейскі варыянт капіталізму сёння зноў усталёўвае закон джунгляў: мацнейшы авалодвае слабейшым, а дзе гавораць грошы, там маўчыць праўда. Але ж закон дэмакратыі гучыць: мацнейшы абараняе слабейшага. Пытанні, якія перасылае свету Беларусь, простыя і ў наш час універсальныя. Індывід ці маса? Адкрытая дэмакратыя ці закрытае грамадства? Талерантнасць і свабода ці таталітарызм? Шлях, на якім мы зрэдукавалі дэмакратыю да бізнэсу, не дзейнічае. Пратэсты ў Беларусі – гэта і мужная абарона правоў чалавека. Абарона правоў нас усіх. Вы змагаецеся супраць бяспраўя, на сваім канале “Страна для жизни” Вы паказвалі бюракратычнае свавольства, выкрывалі карупцыю. Вы не баіцёся публічна бараніць права. Гэтак Вы бароніце і свабоду выказванняў. А яна ляжыць у падмурку правоў чалавека, яна –

корань чалавечнасці, маці праўды. Абсякаць свабоду слова значыць таптаць правы чалавека ў зародку, душыць людскасць, перашкаджаць праўдзе.

Дарагі Сяргей, я вельмі чакаю дня, калі Беларусь будзе краінай дэмакратыі, а голас кожнага грамадзяніна будзе мець аднолькавую вагу. Спадзяюся, што тыя мужныя людзі, якім гэтак, як Вам, сёння ў Беларусі закрываюць раты, якіх арыштоўваюць, катуюць за іх погляды, – гэта апошнія ахвяры дыктатара Лукашэнкі. Цяпер нам патрэбная халодная галава, ясны розум, адважнае мысленне. Праўда ў гэты час настолькі затуманеная і скрытая, а мана настолькі ўсеагульна пашыраная, што праўду не пазнае той, хто яе не любіць. Людзі Беларусі знаходзяцца на вуліцах. Гэта жывыя партрэты ўпартасці і годнасці. У кожнай напружанай эпосе існуюць ўяленыя помнікі асабістай адвагі. Такім быў на першы погляд непрыкметны ўчынак рабочага гамбургскіх верфяў. У 1936 годзе пры ўрачыстым спусканні на ваду ваеннага карабля ён адмовіўся ўзняць разам з натоўпам правую руку ў гітлераўскім вітанні. Фотаздымак быў апублікаваны на 60 гадоў пазней. На ім мужчына пасярод лесу ўзнятых рук. Таксама жывы партрэт упартасці і годнасці. Яго далейшы лёс невядомы. Свабода не існуе, калі не праяўляецца ў канкрэтных учынках. Вы паказваеце, што нам патрэбнае пачуццё маралі, каб мы ўтрымалі тое, што ў нашых жыццях ёсць добрага і справядлівага. Вы зноў паўтараеце і нагадваеце свету старую праўду, што мера нашай правакатыўнай надзеі ёсць мерай нашай здольнасці дамагацца чагосьці таму, што гэта маральна, а не толькі таму, што гэтаму забяспечаны поспех. Моладзь у Вашай і нашай краіне па горла накормленая тым, што пра дэмакратыю гавораць толькі тыя, хто яе ганьбяць. Моладзь не хоча, каб папулісты скралі ў яе надзею, будучыню і памянялі яе на летаргію.

Дарагі Сяргей, Ваша знаходжанне ў турме ў эпоху агульнай апатыі мае вялізнае значэнне. Вы паказалі, што мае сэнс паводзіць сябе як грамадзянін адважна. Вы дапамагаеце аднавіць разбітую салідарнасць. Мы ведаем пра Вас і мы на Вашым баку. Можа, і гэтае сведчанне пра нашу інфармаванасць і міжнародную салідарнасць дапамогуць Вам і астатнім перачакаць цяжкія імгненні ў турме. Паляпшэнне адбудзецца толькі тады, калі дыктатарам і людзям ад улады мы будзем ускладняць жыццё і гаварыць пра ўсё адкрыта. Кожны аўтарытарны рэжым урэшце быў вымушаны вызваліць дарогу дэмакратыі. Гэта наша надзея. Надзея і для Беларусі. Трэба толькі вытрымаць.

Радка Дэнэмаркава

28. 10. 2020

## Фэдар Гал (нар. 1945)
славацкі палітык і сацыёлаг, сузаснавальнік, а пазней старшыня руху “Грамадскасць супраць гвалту”.

Пасля сканчэння Сярэдняй хімічна-прамысловай школы ў Зліне некалькі гадоў працаваў рабочым на хімкабінатах, завочна вучыўся ў хіміка-тэхналагічным інстытуце ў Браціславе. У 1992 г. стаў доктарам эканамічных навук Вышэйшай эканамічнай школы ў Празе.
У часы ЧССР належаў да вядомых дысідэнтаў. У лістападзе 1989 г. актыўна ўключыўся ў Аксамітную рэвалюцыю ў Браціславе і сузаснаваў там грамадска-палітычны рух “Грамадскасць супраць гвалту”. У 1992 г., калі распадалася федэрацыя, пераехаў у Прагу, дзе сярод іншага вёў прадпрымальніцкую дзейнасць, заснаваў выдавецтва “G plus G” і тэлевізійную станцыю “NOVA”. З 2009 г. займаецца пераважна кінадакументалістыкай.



# Фэдар Гал

→

# Максім Знак



## Максім Знак (нар. 1981)
юрыст, эксперт некалькіх міжнародных праграм, напр. Усясветнага банка і Развіццёвай праграмы ААН.

У 2020 г. зрабіўся юрыстам выбарчага штабу Віктара Бабарыкі, пасля пачатку актыўных паслявыбарчых пратэстаў быў абраны ў прэзідыум Каардынацыйнай Рады, пасля чаго арыштаваны, супраць Максіма Знака высунута абвінавачанне ў закліку да дзеянняў, якія вядуць да падрыву дзяржаўнай бяспекі. У турме трымаў галадоўку. Жанаты, гадуе сына. Актыўна займаецца спортам (бег, трыятлон), піша і выконвае ўласныя песні.

Дарагі Максіме!

Мяне клічуць Фэдар Гал, я нарадзіўся ў сакавіку 1945 года ў канцэнтрацыйным лагеры Тэрэзін. Я ведаю цану свабоды. У лістападзе 1989 года ў Славакіі я быў сузаснавальнікам руху “Грамадскасць супраць гвалту” і ад пачатку ўваходзіў у яго кіраўніцтва. У 1990 годзе мы выйгралі першыя свабодныя выбары пасля дзесяцігоддзяў уціску і рэпрэсій. Гэта быў самы векапомны перыяд майго жыцця. Насуперак многім памылкам і пралікам, якія мы дапусцілі, гэта быў важны момант нашай мадэрнай гісторыі. Адважуся сказаць, што самы важны з канца другой усясветнай вайны.

Ужо больш як трыццаць гадоў мы жывем у адкрытым і дэмакратычным грамадстве. Гэта зусім не прагулка па расквітнелым садзе, але мы самі яго ствараем. Мы плацілі і па-ранейшаму плацім за гэта ахвяры.

Я сачу за падзеямі ў Беларусі з пашанай. Сачу за гісторыямі людзей, якія негвалтоўна супраціўляюцца гвалту. Я пачуваюся адным з вас. І я ўпэўнены, што ў сваім змаганні вы пераможаце.

Зычу асабіста Вам і ўсім Вашым блізкім адвагі, вытрымкі і здароўя.

Фэдар Гал

## Вацлаў Малы (нар. 1950)

дапаможны пражскі біскуп, сузаснавальнік Камітэта абароны несправядліва пераследаваных



У 1976 г., па сканчэнні вучобы на рыма-каталіцкім кірыламефодзіеўскім багаслоўскім факультэце ў Празе, быў высвечаны на святара. У 1977 г. падпісаў “Хартыю 77” і сузаснаваў Камітэт абароны несправядліва пераследаваных. Дзеля гэтага ў 1979 г. дзяржава пазбавіла яго сваёй згоды на выкананне духоўнай дзейнасці, Вацлаў Малы быў абвінавачаны ў падрыве рэспублікі і 7 месяцаў правёў у турме. Да 1989 г. працаваў качагарам і памочнікам землямера. У той жа час таемна выконваў абавязкі святара і ўдзельнічаў у выданні каталіцкага самвыдату. З 1988 г. быў сябрам Хельсінскага камітэта.

Падчас Аксамітнай рэвалюцыі быў вядоўцам вялікіх народных сходаў, быў сузаснавальнікам Грамадскага форуму і яго першым спікерам. У 1997 г. зрабіўся дапаможным пражскім біскупам. Актыўна займаецца праблематыкай палітычных вязняў і імкнецца негвалтоўным чынам выступаць супраць аўтарытарных рэжымаў і таталітарных практык. Яго біскупскі дэвіз: “Пакора і праўда”.

## Вацлаў Малы

➔

## Марыя Бабовіч



## Марыя Бабовіч (25 гадоў)

ураджэнка Мазыра, пасля сканчэння БДЭУ засталася ў Мінску, з сяброўкай зняла кватэру і знайшла працу ў кавярні. Пасля забойства на Пушкінскай плошчы Аляксандра Тарайкоўскага там узнік народны мемарыял, да якога насілі кветкі і вянкі ў тым ліку паслы еўрапейскіх краін. Начамі камунальнікі прыбіралі вянкі і кветкі і ліквідавалі надпісы на асфальце. Марыя Бабовіч разам з Дзянісам Грахановым была той, хто аднавіў вялікі надпіс “Не забудзем!”, за што была затрыманая і абвінавачаная ў асабліва буйным наўмысным пашкоджанні чужой маёмасці. Марыі пагражае да 10 гадоў турмы.

## Вацлаў Малы → Марыя Бабовіч

Шаноўная Марыя Бабовіч!

Я даведаўся пра Вашу смеласць. Вам хапіла адвагі аднавіць надпіс на тратуары ў Мінску, які нагадваў, што на тым месцы падчас дэманстрацый супраць сфальсіфікаваных вынікаў прэзідэнцкіх выбараў быў забіты Аляксандр Тарайкоўскі. Я захапляюся Вамі. Хачу Вас упэўніць, што Вы не забытая. Выказваю Вам сваю салідарнасць. Вы не аддалі перавагу бяспечнаму назіранню за падманам, гвалтам і несправядлівасцю, але і нягледзячы на рызыку пакарання вы ясна вырашылі сказаць няўмольнае “Не” злу і хлусні. Для мяне Вы прыклад сілы духу, які немагчыма застрашыць. Верце, што Вы сталіся выклікам выйсці з зоны камфорту мне і майму атачэнню. Тут мы жывем у свабодзе і за нашу грамадзянскую пазіцыю нас ніхто не карае. Тым больш нам трэба бачыць канкрэтныя прыклады тых, хто захоўвае чысціню сумлення нават у неспрыяльных палітычных умовах. Я дзякую Вам і буду надалей сачыць, як вырашыцца Ваш выпадак. Спадзяюся, Вы дачакаецеся справядлівасці, і крымінальны пераслед будзе спынены. Калі не, пра Вас ужо ведаюць за межамі Беларусі, і гэта не вытхнецца бясследна. Свабоду нельга падзяліць, а таму мне не абыякавы лёс адважных беларускіх грамадзян, якія зазнаюць пераслед. Зычу Вам шмат духоўнай і душэўнай сілы працягваць шлях праўды і справядлівасці.

Вацлаў Малы, каталіцкі біскуп     6.11.2020

## Моніка Макдона Паерава (нар. 1966)

былая дыпламатка і студэнцкая лідарка падчас Аксамітнай рэвалюцыі 1989 г., актывістка і ўніверсітэцкая выкладчыца.



Падчас вучобы на філасофскім факультэце Карлавага ўніверсітэта ў лістападзе 1989 г. зрабілася рэпрэзентанткай арганізацыі STIS (студэнцкі прэсава-інфармацыйны цэнтр) і такім чынам пачала супрацоўнічаць з гарадскім камітэтам Сацыялістычнага саюза моладзі пры падрыхтоўцы дэманстрацыі на пражскім Альбертаве. 21 лістапада 1989 г. была абраная ў Каардынацыйны страйкавы камітэт студэнтаў вышэйшых школ і выступала ў якасці яго прэс-сакратаркі.

Затым у 1990-1998 гг. працавала культурным аташэ ў чэхаславацкім і чэшскім пасольствах у Парыжы, у Радзе Еўропы ў Страсбуры. У 1998-1999 гг. была прэс-сакратаркай міністэрства замежных спраў Чэшскай Рэспублікі.

Моніка Макдона Паерава – старшыня грамадскага аб’яднання “Так Еўропе”, аўтарка і вядоўца праграмы “Еўрапейскі мануал” на чэшскім тэлебачанні, яна апублікавала некалькі прац па еўрапейскай палітыцы. З 2004 г. выкладае ў Нью-ёрскім універсітэце ў Празе.

# Моніка Макдона Паерава
# ➔
# Павал Севярынец



## Павал Севярынец (нар. 1976)

палітык, журналіст, пісьменнік.

Быў адным з заснавальнікаў “Маладога Фронту” (у Беларусі ў рэгістрацыі некалькі разоў адмоўлена, урэшце арганізацыя была зарэгістраваная ў Чэхіі), затым адзін з лідараў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (паводле Севярынца, беларуская ідэя – гэта Ісус Хрыстос, які размаўляе па-беларуску). За выступы супраць Лукашэнкі ўпершыню асуджаны ў 2005 г. З таго часу правёў у турмах у суме каля 6 гадоў. Ён аўтар некалькіх кніг эсэістычнага характару. Апошні раз быў затрыманы ў чэрвені 2020 г. на дарозе дадому і пасля некалькіх 15-сутачных тэрмінах за ўдзел у перадвыбарчых мітынгах быў аб’яўлены падазраваным у арганізацыі масавых хваляванняў. З жонкай Вольгай гадуе малога сына.

Дарагі Павал!

Я гляджу на Ваш малады і шляхетны твар і спрабую ўявіць, як Вы пачуваецеся, пра што сёння думаеце.

Хачу Вам сказаць, што я ведаю страх допытаў, уласнай асечкі, турмы.

Ведаю, наколькі бяссільнай я пачувалася ў камуністычнай Чэхаславакіі і прызнаю: я думала, што канца камунізму ў сваім жыцці не дачакаюся.

Я малюся за Вас і Вашых сяброў штодня – у цудоўнай Празе, дзе касцёлы камфортныя і цёплыя, а таксама ў маёй роднай вёсцы ў Судэтах, дзе ў нас толькі маленькая халодная каплічка – там я адчуваю сябе бліжэй да пазнання.

Я ведаю, што аднойчы будзе свабодна жыць і Ваша Беларусь і ўсім сэрцам спадзяюся, што гэта здарыцца неўзабаве!

Не здавайцеся, калі ласка, і хай Вас беражэ Бог!

PhDr. Моніка Макдона-Паерава,

Спікерка студэнцкага страйку ў 1989 годзе, дыпламатка і выкладчыца ўніверсітэта

## Павел Рыхецкі (нар. 1943)

старшыня Канстытуцыйнага суда Чэшскай Рэспублікі



Вывучаў юрыспрудэнцыю на юрыдычным факультэце Карлавага ўніверсітэта, затым стаў падпісантам "Хартыі 77" і новапаўсталаму дысідэнцкаму руху дапамагаў з юрыдычнымі дакументамі. У той час публікаваўся ў самвыдаце і эміграцыйных часопісах. У 1989 г. стаў адным з сузаснавальнікаў Грамадскага форуму.

Пасля Аксамітнай рэвалюцыі быў прызначаны на пасаду генеральнага пракурора, а потым намесніка старшыні федэральнага ўраду. Пасля 1992 г. працаваў адвакатам, спецыялізаваўся перадусім на заканадаўчай сферы. У 1996 г. быў абраны сенатарам за Чэшскую сацыял-дэмакратычную партыю. Праз два гады зноў стаў намеснікам старшыні ўраду і старшынёй яго заканадаўчай рады. У 2020 г. быў уганараваны ордэнам Т.Г. Масарыка 1 ступені за выбітныя заслугі ў развіцці дэмакратыі, гуманнасці і правоў чалавека.

# Павел Рыхецкі

→

# Марыя Калеснікава



## Марыя Калеснікава (нар. 1982)

паводле адукацыі флейтыстка і дырыжорка.

Больш за дзесяць гадоў вучылася і працавала ў нямецкім Штутгарце. У 2017 г. стала арт-дырэктаркай новай культурнай прасторы ў Мінску, заснаванай Белгазпрамбанкам, на чале якога тады стаяў Віктар Бабарыка. Увесну 2020 г. зрабілася сяброўкай выбарчага штабу Бабарыкі, а пасля яго арышту і недапушчэнні да выбараў стала сяброўкай жаночага "выбарчага трыумвірату" Калеснікава – Цапкала – Ціханоўская. Далей увайшла ў склад прэзідыума Каардынацыйнай Рады. З прычыны яе вялікай актыўнасці была выкрадзена спецслужбамі, яе змушалі пакінуць тэрыторыю Беларусі, але Калеснікава на памежным пераходзе парвала свой пашпарт, за што адразу была ўзятая пад варту і цяпер абвінавачваецца ў закліках да дзеянняў, якія вядуць да падрыву дзяржаўнай бяспекі.

Брно, 9. 11. 2020

Шаноўная спадарыня Марыя!

Ужо некалькі гадоў я з занепакоеннем сачу за развіццём падзей у Беларусі. Яна робіцца адным з апошніх запаведнікаў посткамуністычнага свету, які вызначаецца яўным дэфіцытам асноўных прынцыпаў дэмакратычнай прававой дзяржавы, што мэтава замяняюцца аўтарытарнымі метадамі кіравання. Выразным сімвалам гэтай сітуацыі ёсць роля прэзідэнта Лукашэнкі і сістэматычнае парушэнне асноўных правоў і свабод чалавека. У гэтыя дні мы ў маёй краіне – Чэшскай Рэспубліцы – будзем узгадваць падзеі лістапада 1989 года, якія выліліся ў падзенне аўтарытарнага рэжыму і адкрылі шлях да стварэння свабоднай дэмакратычнай супольнасці, заснаванай на павазе да правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Я жадаў бы, каб і ў Вашай краіне адбылося вызваленне і эмансіпацыя грамадзянскай супольнасці, якая сваё стаўленне да рэпрэсіўнага рэжыму Лукашэнкі выказвае не толькі ў Мінску, але і на вуліцах астатніх беларускіх гарадоў. Таксама я лічу сваім абавязкам, асабліва займаючы пасаду старшыні Канферэнцыі еўрапейскіх канстытуцыйных суддзяў, апеляваць да вызвалення беларускіх палітычных вязняў.

Я вельмі рады, што пры Цэнтры эксперыментальнага тэатра ў нашым горадзе Брно будзе адкрыта Амбасада незалежнай беларускай культуры, якой шчыра і ад усяго сэрца зычу поспехаў.

З павагай і пажаданнем усяго добрага

JUDr. Павел Рыхецкі, dr. h. c.

Старшыня Канстытуцыйнага суда Чэшскай Рэспублікі

## Вольга Сомэрава (нар. 1949)
дакументалістка і рэжысёрка



У 1977 г. скончыла кіна- і тэлевізійны факультэт Акадэміі мастацтваў па кафедры дакументальнай творчасці, пасля чаго працавала рэдактаркай секцыі дакументалістыкі Чэхаславацкага тэлебачання, пазней рэжысёркай у Кароткаметражным кіно ў Празе (да 1993 г.).

У 1991–2002 гг. выкладала ў пражскай кінаакадэміі, дзе ў 1992 г. была абраная старшынёй Акадэмічнага сената. Сябра Асацыяцыі рэжысёраў і сцэнарыстаў, а таксама Чэшскай кіна- і тэлевізійнай акадэміі.

У якасці рэжысёркі Кароткаметражнага кіно ў Празе 12 гадоў здымала дакументальныя фільмы для кінатэатраў фармату 35 мм. Пасля рэвалюцы 1989 г. здымала фільмы для Чэшскага тэлебачання, у якіх займалася сацыяльнай тэматыкай і міжчалавечымі стасункамі, пазней выбітнымі асобамі і феноменамі грамадскага і творчага жыцця, фемінізмам і нядаўняй гісторыяй нашай краіны. Зняла 22 фільмы, за якія атрымала 40 прэмій на чэшскіх і замежных кінафестывалях.

# Вольга Сомэрава

->

# Аляксандр Васілевіч



## Аляксандр Васілевіч
Васілевіч – прадпрымальнік у рэкламнай сферы, уладальнік вядомай культурніцкай галерэі ў Мінску і некалькіх інтэрнэт-часопісаў ці парталаў.

Быў затрыманы 28 жніўня і пакуль не абнародавана, паводле якога артыкула яго абвінавачваюць. Паводле таго самага пакуль засакрэчанага артыкула праходзіць як падазраваная ягоная жонка Надзея Зелянкова, якая застаецца дома з дачкой, а ў канцы лістапада мае нарадзіць сваё другое дзіця.

Дарагі Аляксандр!

Мы са страхам і хваляваннем сачылі за адважным супрацівам беларускай грамадзянскай супольнасці дыктатару, які ўжо бясконца доўга мучае вашу краіну таталітарным душэннем грамадзянскіх свабод і правоў чалавека. Мы з жахам сачылі за жорсткімі атакамі ўзброеных людзей на мужчын і жанчын, якія патрабуюць свабодных і справядлівых выбараў і неад'емнага права еўрапейскіх грамадзян XXI стагоддзя адмежавацца ад маны і жорсткасці дзяржаўнага апарату ў дачыненні да ўласнага народа.
Трыццаць гадоў таму грамадзяне Чэхаславакіі, у адрозненне ад беларусаў, дзякуючы геапалітычнай сітуацыі мелі шанец пазбавіцца ад ненавіснага камуністычнага рэжыму, які душыў нас сорак гадоў. Гарбачоўскі Савецкі Саюз на момант паслабіў хватку, і нам удалося вызваліцца і вярнуцца да дэмакратычных прынцыпаў, на якіх сто гадоў таму ўзнікла Чэхаславакія. Дзякуючы прэзідэнту Вацлаву Гаўлу наша рэспубліка падкрэслівала важнасць датрымлівання правоў чалавека ва ўсім свеце, на Кубе, у Кітаі, у Тыбеце, а таксама ў Беларусі. Няўрадавыя арганізацыі, напрыклад, "Чалавек у нядолі", падтрымліваюць беларускую апазіцыю яшчэ з пачатку дзевяностых гадоў.
Чэшскія СМІ рэгулярна негатыўна выказваліся наконт заведзеных Лукашэнкам палітычных умоваў.
Чэшская Рэспубліка адыгрывала ролю актыўнага абаронцы правоў чалавека за мяжой, прычым гэты вобраз на міжнароднай арэне значна ўзмацняла асоба прэзідэнтра Вацлава Гаўла, дысідэнта і змагара супраць аўтарытарнага рэжыму. Менавіта ён падтрымліваў станаўленне грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, бо яна неабходная для паспяховага функцыянавання дэмакратыі і ёсць пагрозай для таталітарнага недэмакратычнага рэжыму. Таксама ён імкнуўся прыцягнуць увагу да аўтакратычнага характару Лукашэнкавага рэжыму, што мусіла паспрыяць таму, каб у Еўразвяза расплюшчыліся вочы. Вацлаў Гавэл у сваю бытнасць прэзідэнтам некалькі разоў наведаў ці прыняў прадстаўнікоў апазіцыі Беларусі.
З 1997 года паўстала цеснае супрацоўніцтва паміж Чэшскай Рэспублікай і беларускай апазіцыяй, у тым годзе ў Беларусі ўзнікла і "Хартыя 97" паводле ўзору чэхаславацкай "Хартыі 77".

Мяне цешыць, што гістарычна першую міжнародную Прэмію Вацлава Гаўла за правы чалавека атрымаў Алесь Бяляцкі, кіраўнік найбуйнейшай беларускай праваахоўнай арганізацыі "Вясна", а ў мінулым ён быў намінаваны на Нобелеўскую прэмію міру. Праз абвінавачанне ва ўяўных падатковых махінацыях ён сядзеў у турме. Ён заўсёды казаў, што Вацлаў Гавэл быў яго духоўным памочнікам.
Свет пра Беларусь не забывае, доказ гэтага – што Еўрапейскі парламент прэміяй Сахарава за свабоду ўганараваў беларускую апазіцыю.

**Вольга Сомэрава → Аляксандр Васілевіч**

Мы з захапленнем сочым за нястомным супрацівам беларускай грамадзянскай супольнасці дыктатару, што доўжыцца ўжо тры месяцы.

Я кінадакументалістка і зняла пятнаццаць фільмаў пра жахі і вычварнасць таталітарных рэжымаў, нацызму і камунізму. Я здымала адважных людзей, удзельнікаў руху супраціўлення падчас нацысцкай акупацыі і дысідэнтаў, якія падпісалі "Хартыю 77", і сваёй адвагай напаўнялі ідэю, што КОЖНЫ НЯСЕ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ЎВЕСЬ СВЕТ, або, калі нехта несвабодны, то несвабодны і я.
У маім фільме пра нацыянальнага героя Яна Палаха, які пазбавіў сябе жыцця самаспаленнем, каб абудзіць чэшскае грамадства з летаргіі пасля савецкага ўварвання ў 1968 годзе, двойчы гучыць думка, што без свабоды нельга жыць, і часам за яе трэба ахвяраваць жыцці, як гэта зрабіў не толькі Ян Палах, але і многія смелыя людзі да яго.
Мы, чэхі, жылі ў двух таталітарных рэжымах паўстагоддзя. Мы ведаем, што гэта значыць, і таму мы так салідарныя з беларусамі ў іх змаганні за свабоду.

Дарагі Аляксандр Васілевіч, ужо два месяцы вы не можаце дзяліцца ўсім, што адбываецца ў Вашым жыццём і Вашым змаганні, з сям'ёй. Ваша жонка Надзея чакае дзіця. Я думаю пра вашу сям'ю і веру, што прыход вашага нашчадка на свет будзе радасным. Я веру ў вольную Беларусь!

Прага, 2.11.2020 — Вольга Сомэрава

## Эрык Табэры (нар. 1977)
чэшскі журналіст, публіцыст, галоўны рэдактар штотыднёвіка “Respekt”



Скончыў бакалаўрыят па спецыяльнасці журналістыка на факультэце сацыяльных навук Карлавага ўніверсітэта, тамсама нейкі час вывучаў паліталогію. У рэдакцыі часопіса “Respekt” пачаў працаваць яшчэ ў 1997 г., з 2009 г. стаў яго галоўным рэдактарам.

У сваёй каментатарскай і публіцыстычнай дзейнасці займаецца найперш унутранай палітыкай. Ён лаўрэат некалькіх прэстыжных прэмій, напр., Журналісцкай перапёлкі для журналістаў да 33 гадоў (2002), журналісцкай прэміі імя Ф. Пероўткі (2008) ці Журналісцкай прэміі за 2011 год.

Шэраг поспехаў зазнаў і ў публіцыстыцы. У 2006 г. выйшла яго першая кніга “Не замінайце, мы кіруем” (прэмія Тома Стопарда). У 2007 г. паводле кнігі ўзнік аднайменны дакументальны фільм, які атрымаў прэмію “Trilobit”. Пакуль апошні значны поспех Эрыка Табэры – прэмія Magnesia litera (2018) за трэцюю кнігу “Пакінутае грамадства: чэшскі шлях ад Масарыка па Бабіша”.

# Эрык Табэры

→

# Сцяпан Латыпаў



## Сцяпан Латыпаў (40 гадоў)
арбарыст і прамысловы альпініст.

У двары яго дому на сцяне трансфарматарнай будкі ўзнікла графіці т.зв. дыджэяў перамен, якое стала сімвалам пратэсту, і хоць яго штоноч зафарбоўвалі на загад зверху, мясцовыя жыхары яго штораз аднаўлялі. Калі камунальнікі аднаго разу прыйшлі да графіці ў суправаджэнні людзей у цывільным, якія цвердзілі, што яны з міліцыі, Сцяпан закрыў сабой графіці і патрабаваў паказаць пасведчанне. Тады да Сцяпана далучыліся іншыя жыхары, і камунальнікі з міліцыяй адышлі ні з чым. Аднак праз пару дзён да яго ўварваліся дадому, ён быў збіты і арыштаваны. Падчасператрусу ў яго дому знайшлі хімікаты, якія Сцяпан выкарыстоўваў у сваёй працы пры вынішчэнні баршчэўніку, і яго абвінавацілі ў намеры ўжыць атруту супраць міліцыі. Пасля таго, як пра гісторыя Сцяпана Латыпава разляцелася па сацыяльных сетках, ён быў апазнаны на ранейшым відэа, на якім раздае кветкі ўдзельніцам першага жаночага маршу.

## Эрык Табзры → Сцяпан Латыпаў

Шаноўны і дарагі Сцяпан!

Я пішу вам са значным хваляваннем, бо для мяне гэта выключны момант. У мяне столькі ўсяго на сэрцы, але мной рухаюць галоўным чынам эмоцыі, якія цяжка пакласці на паперу. Мы не знаёмыя, і тым не менш, у мяне такое адчуванне, што мы блізкія сябры. Людзі, якія хочуць жыць вольна, пэўным чынам звязаныя між сабой, і не важна, наколькі далёка яны адно ад аднаго жывуць і на якой мове размаўляюць. Тым больш, калі яны з краін, дзе свабода не дадзенасць. Мы, чэхі, ужо свабодай нейкі час цешымся, вас, я веру, гэта неўзабаве чакае.
Я ведаю, што ў мяне няма практычнай магчымасці, як вас падтрымаць. Але хачу вам прынамсі даць ясны знак і абяцанне, што дыктатарскаму рэжыму ніколі не ўдасца заплямiць ваша імя. Мы ведаем, што ўсе яго абвінавачанні сфабрыкаваныя. У рэжымах накшталт Лукашэнкаўскага знаходжанне ў турме бывае адзнакай прыстойнасці і не наадварот. Зрэшты, я пішу вам з краіны, у якой першы дэмакратычны прэзідэнт Вацлаў Гавэл і першы свабодны міністр замежных спраў Іржы Дынстбір, перш чым занялі свае пасады, прайшлі праз некалькі турмаў. І пасадзіла іх туды, гэтаксама як вас, таталітарная ўлада.
За падзеямі ў Беларусі я сачу праз СМІ ці сацыяльныя сеткі і вельмі захапляюся людзьмі, якія, ведаючы, што ім пагражае, зноў і зноў выходзяць, каб паказаць людзям без твараў, наколькі прагнуць свабоды. І часта на мяне накатвае моцнае ўзрушэнне ад той далікатнай адвагі з аднаго боку і гневу на гвалтаўнікоў з другога. Вы стаіце перад уяўнай перавагай у сіле, у якой у руках нібыта ўсе козыры, але ў яе няма справядлівасці і сардэчнасці. І менавіта таму свет на вашым баку. Яны бароняць свае выгады, сваю ўладу, але вы бароніце чалавечнасць.
Я самакрытычна мушу прызнаць, што мне ніколі б не прыйшло да галавы, што менавіта Беларусь дасць усяму свету такі ўрок. Вы сталі для нас натхненнем.

Шаноўны і дарагі Сцяпан, мы амаль аднаго ўзросту. Я веру, што аднойчы ў нас надарыцца нагода напісаць адно аднаму ці нават асабіста сустрэцца як прадстаўнікам двух нудных свабодных грамадстваў. У нашых лістах ужо не будзе ані згадкі пра турму ці пагрозы, а толькі, скажам, пра надвор’е, добры канцэрт або фільм.

Я думаю пра вас.
Эрык

## Катэржына Тучкава (нар. 1980)
пісьменніца, публіцыстка, куратарка



У 1999-2006 вывучала гісторыю мастацтва і чэшскую філалогію на філасофскім факультэце Універсітэта Масарыка ў Брне. Далей працягвала вывучэнне мастацтвазнаўства ў аспірантуры ў пражскім Карлавым універсітэце, у 2014 г. паспяхова абараніла дысертацыю. Падчас вучобы выдала шэраг навуковых публікацый па выяленчым мастацтве, напр. “На вастрыі гісторыі – помнікі на вуліцах” (Брно, 2013) ці “Фабрыка – гісторыя тэкстыльных баронаў з мараўскага Манчэстэра (Брно, 2014).

Тучкава – аўтарка некалькіх паспяховых раманаў, напр., “Выгнанне Герты Шнірх” (2009) ці “Жыткаўскія багіні” (2012, у перакладзе на беларускую выйшаў у 2015).

У 2018 для брненскага тэатра “Гусь на канаце” напісала п’есу “Вітка” на матывы жыцця першай чэшскай кампазітаркі і дырыжоркі.

Катэржына Тучкава супрацоўнічала ці супрацоўнічае з многімі літаратурнымі і грамадска-культурнымі выданнямі.

# Катэржына Тучкава

➔

# Марфа Рабкова



## Марфа Рабкова (25 гадоў)
каардынатарка валанцёраў самай вядомай беларускай праваабарончай арганізацыі “Вясна”.

Вучылася на факультэце прыродазнаўства БДПУ, цяпер працягвае навуку ў ЕГУ ў Вільні па спецыяльнасці Міжнароднае права. Падчас передвыбарчага і выбарчага перыяду была адной з галоўных каардынатарак незалежных назіральнікаў, з прычыны чаго знаходзілася ў кантакце прыблізна з 1500 валанцёрамі, некаторыя з якіх былі затрыманыя яшчэ падчас галасавання. Марфа Рабкова была арыштаваная і абвінавачаная ў падрыхтоўцы і навучанні людзей для арганізацыі масавых хваляванняў. Марфа год замужам, дома апрача мужа яе чакае кот.

## Катэржына Тучкава → Марфа Рабкова

Дарагая Марфа!

Цяпер я сяджу за сталом у сваім працоўным кабінеце, у атачэнні паліц з кнігамі, якія я апошнія дваццаць гадоў збірала, сяджу перад экранам кампутара, маючы перад сабой пусты белы аркуш – і я ў роспачы. Што б я Табе, дарагая Марфа, магла напісаць, каб дадаць Табе надзеі і ў той жа час каб гэта не прагучала павярхоўна і бязглузда? Ты – зачыненая ў турме з перспектывай колькігадовага тэрміну – чытаеш ліст ад мяне, якая сядзіць у бяспецы свайго дому, прачытвае навіны з Тваёй краіны і не можа быць Табе карыснай больш, чым парай слоў. Гэта няшмат. Вось жа, хай я прынамсі знайду тыя словы, якія Цябе падбадзёраць.

Пачну вось чым, дарагая Марфа: я хацела б, каб Ты ведала, што за падзеямі ў Тваёй краіне мы ў Чэхіі ўважліва сочым. Тэлебачанне, радыё і друк у апошнія месяцы рэгулярна інфармуюць пра зманіпуляваныя выбары, пра дэманстрацыі, пра несувымерныя рэпрэсіі. Рэпартажы, фатаграфіі, відэа – усё гэта прыцягвае нашу ўвагу, а ў некаторых да таго ж выклікае трывожнае пачуццё дэжавю. Бо сёлета ў лістападзе спаўняецца трыццаць адзін год з часу, як мы праз такое таксама прайшлі. І пачыналася ўсё падобна: на галоўным пражскім праспекце сабраліся людзі падобнага ўзросту, як Ты, да іх па ўсёй краіне далучаліся ўсё новыя і не спыніліся, пакуль рэжым не абрынуўся. Гэта каштавала неймаверных высілкаў мноства звычайных людзей, чатыры дзясяткі гадоў няўтомнай апазіцыйнай працы, але ўрэшце спатрэбілася пару тыдняў – і ў нашай краіне ўсё змянілася. Я б так хацела суцешыць Цябе перакананнем, што гэтак адбудзецца і ў Вас.

Гэтым я хачу сказаць, дарагая Марфа, што тое, што цяпер адбываецца ў Беларусі, для многіх з нас вельмі блізкае. Гэта надзвычайная гістарычная падзея, у якой да таго ж ёсць свае твары. Напрыклад, Твой. Досыць пару клікаў, і людзі могуць пра Цябе шмат чаго даведацца, скажам, што Цябе трымаюць у турме без магчымасці кантактаваць з сям'ёй, у няпэўнасці бясчасся. Спадзяюся, Табе хоць трохі дапаможа ўсведамленне таго, што ты ў сваёй бядзе не адна. Акрамя Тваіх блізкіх, якія імкнуцца прыцягнуць увагу да Твайго лёсу, акрамя тых, хто па-ранейшаму выходзіць на дэманстрацыі на мінскіх вуліцах, на Тваім баку стаяць і тыя, пра каго ты несумненна ніколі не чула. Напрыклад, я. І сотні іншых, хто пра Цябе піша, замаўляе друк Твайго твару для бігбордаў або проста стараецца інфармаваць пра Тваю сітуацыю ў сацыяльных сетках пад хэштэгам #stojimezabeloruskem. Што значыць, што мы стаім на баку людзей, якія прагнуць свабоды, як яе прагнеш Ты, стаім на баку твайго гневу, з якім ты мусіш азірацца на дваццаць пяць гадоў аўтарытарнага кіравання аднаго апантанага ўладай чалавека, мы стаім на баку Твайго рашэння не дапусціць, каб рэжымная машынэрыя сваім ходам пасоўвалася далей, мы стаім на баку Твайго страху, бо рызыка, якую Ты прымаеш, і ахвяра, якую прыносіш, жахлівыя. Мы стаім на Тваім баку, бо Ты сімвал – прагнення змены, справядлівасці, свабоды, сімвал адвагі, высокай грамадзянскай адказнасці, вытрымкі.

Не ведаю, дарагая Марфа, ці гэты ліст да Цябе дойдзе і не магу ведаць, ці выканае сваю мэту, ці ён Цябе хоць трохі падбадзёрыць. Але праўда ў тым, што ёсць надзея, бо надзея – гэта Ты сама. Тое, што Ты існуеш, тое, што Ты вырашыла не маўчаць і прамовіць, тое, што ты была гатовая гэтак рызыкаваць – гэта ўсё найвялікшы доказ, што ў сістэмы, якая нявечыць Тваю краіну, павольна, але няўхільна, падкошваюцца ногі, што Твая краіна мае будучыню.

Зычу Табе, каб яе дачакалася Ты і Твае блізкія як найхутчэй.

Катэржына Тучкава

## Мілаш Выстрчыл (нар. 1960)

старшыня Сената Парламента Чэшскай Рэспублікі



Вучыўся на фізічна-матэматычным факультэце Універсітэта Масарыка ў Брне, спецыяльнасць матэматыка. Затым выкладаў у гімназіі Отакара Бржэзіны, а з 2009 г. выкладае ў Вышэйшай школе палітэхнічнай у Іглаве. Палітычную кар’еру распачаў падчас Аксамітнай рэвалюцыі, калі сузаснаваў Грамадскі форум у горадзе Тэлч. У 1991 г. уступіў у новаўзніклую Грамадзянска-дэмакратычную партыю, у якой цяпер займае пасаду намесніка старшыні.

З 2010 г. працуе ў Сенаце Парламента Чэшскай Рэспублікі; у 2016-2020 гг. Быў старшынёй сенатарскага партыйнага клубу. У цяперашні час заступіў свайго папярэдніка Яраслава Кубэру і нягледзячы на супраціў астатніх найвышэйшых дзяржаўных прадстаўнікоў ажыццявіў візіт на Тайвань. Заканадаўчы двор парламента Тайваня ўганараваў Мілаша Выстрчыла медалём за парламенцкую дэмакратыю.

# Мілаш Выстрчыл

→

# Віктар Бабарыка



## Віктар Бабарыка (нар. 1963)

банкір і мецэнат.

З 2000 г. кіраваў Белгазпрамбанкам. Заснаваў некалькі дабрачынных фондаў (на падтрымку культуры, дапамогу дзецям і да т.п.). Стаўся бадай найпапулярнейшым кандыдатам на прэзідэнта і да выбараў дапушчаны не быў. У сфабрыкаваным працэсе разам са сваім сынам Эдуардам абвінавачваецца ў эканамічных злачынствах.

Прага, 13 лістапада 2020 г.

Шаноўны спадар Віктар Бабарыка!

Сардэчна Вас вітаю і хачу Вас запэўніць, што я падтрымліваю Вас і ад душы зычу Беларусі і беларускаму народу як найхутчэйшага прыходу свабоды і дэмакратыі.

Я перакананы, што нам не можа быць абыякава, што адбываецца вакол нас. Вацлаў Гавэл напісаў, што абыякавасць да лёсу цэлага ёсць якраз тым, што адчыняе дзверы злу.

Шаноўны спадар Бабарыка, ліст, які я Вам пішу, сімвалічны, адкрыты, перадусім гэта ліст падтрымкі. Са значна большай уцехай я б даслаў яго Вам так, каб ён трапіў непасрэдна ў Вашы рукі або я б Вам з радасцю проста патэлефанаваў і падбадзёрыў Вас. На жаль, гэта немагчыма. Нягледзячы на тое, што я ўсяляк спрабаваў з Вамі скантактавацца, вынікам было паведамленне, што даслаць ліст Вам у рукі або патэлефанаваць Вам немагчыма.

Прызнаюся, што мяне гэта не здзівіла. Вы палітычны вязень, і я добра ведаю, што гэта за сабой цягне. У нас у Чэхіі таксама былі палітычныя вязні. Некаторых камуністы пакаралі смерцю, некаторых катавалі, некаторых саслалі на прымусовыя працы, а некаторых, якіх зламілі ці якім падарвалі здароўе, адпусцілі.

Таму я пра Вас і пра Беларусь 17 лістапада – у дзень, калі мы здабылі свабоду і пачалі ствараць дэмакратычную сістэму – інтэнсіўна думаю. Думаю пра тое, што ў Вашай краіне ўладарыць чалавек, якога называюць апошнім дыктатарам у Еўропе. Гэты чалавек дзеля ўтрымання сваёй улады не грэбуе скарыстацца якімі-колечы сродкамі, у тым ліку сфабрыкаванымі абвінавачаннямі і зняволеннем магчымых супернікаў, што напаткала і Вас. Нягледзячы на ўсе яго старанні, у сёлетніх жнівеньскіх выбарах ён відавочна прайграў. Аднак ніводны дыктатар ад улады добраахвотна не адмовіцца, бо не здольны разважаць як дэмакратычны палітык і баіцца таго, што з ім маглі б абысціся так, як ён абыходзіцца са сваімі апанентамі.

Калі ласка, ведайце, што таталітарная ўлада, якую падтрымлівае рэпрэсіўны апарат, не здольная вытрымаць настойлівы ціск усіх слаёў грамадства пры падтрымцы дэмакратычных краін усяго свету. Салідарнасць дэмакратычнай супольнасці – адна з асноўных перадумоваў паспяховай барацьбы з таталітарызмам, і мы да змагання беларускага народа за свабоду і дэмакратыю не можам быць абыякавымі.

Я цвёрда веру, што і дзякуючы ціску дэмакратычнай супольнасці Вы і астатнія вязні сумлення ў Беларусі будуць неўзабаве выпушчаны і што вы зможаце пазбыцца зла ў беларускім грамадстве.

Я ведаю, што нядаўна Вы адзначылі дзень нараджэння, таму Вам і Вашай краіне я дазволіў бы сабе пажадаць, каб пасля Вашага скорага вызвалення мы маглі б сказаць, што вы былі апошнімі вязнямі сумлення ў Беларусі.

З павагай

Мілаш Выстрчыл

**Міхаэл Жантаўскі (нар. 1949)**
дыпламат, перакладчык, дырэктар Бібліятэкі Вацлава Гаўла



Пасля сканчэння Карлавага ўніверсітэта і Універсітэта МакДжыл у Манрэале (псіхалогія) працаваў навуковым супрацоўнікам у інстытуце псіхіятрыі ў Празе, дзе займаўся даследаваннем невербальных паводзінаў і тэорыі матывацыі. З 1980 г. працаваў перакладчыкам і публіцыстам. Рэгулярна публікаваўся ў самвыдаце, а з 1988 г. быў пражскім карэспандэнтам агенцтва "Reuters". У год рэвалюцыі 1989 быў адным з заснавальнікаў чэшскага цэнтра ПЭН-клубу, які ў камуністычнай Чэхаславакіі быў забаронены.

Міхаэл Жантаўскі таксама належыць да заснавальнікаў Грамадскага форуму і блізкіх паплечнікаў Вацлава Гаўла, у якога спачатку быў прэс-сакратаром, а пазней і дырэктарам яго прэзідэнцкай управы. З 1992 г. працаваў у дыпламатыі і актыўна займаўся ўнутранай палітыкай. З верасня 2015 г. займае пасаду дырэктара Бібліятэкі Вацлава Гаўла.

## Міхаэл Жантаўскі

→

## Марына Глазава



**Марына Глазава (нар. 1995)**
працуе выкладчыцай англійскай і польскай моваў.

Арыштаваная па справе карагоду на брэсцкай вуліцы падчас вулічных пратэстаў. Абвінавачваецца ў грубым парушэнні парадку. Марына – дачка брэсцкага паэта Уладзіміра Глазава, які некалькі гадоў таму са сваімі вершамі выступаў у пражскай Бібліятэцы Вацлава Гаўла.

Дарагая Марына!

Вітаю Вас з Прагі, з Кнігарні Вацлава Гаўла, дзе Ваш бацька Уладзімір колькі гадоў таму чытаў свае вершы.

З таго моманту, калі я 20 гадоў таму наведаў Мінск, мне баліць сэрца за лёс Вашай краіны і прынамсі на адлегласці я разам са сваімі каляжанкамі і калегамі знаходжуся ў думках з Вамі ў доўгім і адважным змаганні Вашага народа за свабоду і дэмакратыю.

Тады мы ехалі ў Мінск аўтамабілем праз Брэст, спачатку ў якасці незалежных назіральнікаў на дэманстрацыі, якія праходзілі ў сувязі з угодкамі чарнобыльскай катастрофы, што спасцігла і Вашу краіну. Пасля некалькіх сустрэч з афіцыйнымі беларускімі прадстаўнікамі, потым з Вінцуком Вячоркам і іншымі асобамі з беларускай апазіцыі, а таксама са звычайнымі беларускамі і беларусамі, мы ўсвядомілі, што ў сутыкненні паміж рэпрэсіўнай уладай, якая абапіраецца на гвалт, уціск і КДБ, і грамадзянамі, якія імкнуцца да свабоды, мы не можам застацца нейтральнымі. Тое, сведкамі чаго мы былі 26 красавіка 2000 года на мінскіх вуліцах, нагадала нам часы чэхаславацкай аксамітнай рэвалюцыі 1989 года і без доўгіх роздумаў прывяло нас з тратуара, дзе стаялі цікаўнікі, у першыя шэрагі мірнага марша дзясяткаў тысяч пратэстоўцаў. Я ніколі не забуду тое вызваленчае пачуццё.

Еўропа за апошнія дваццаць гадоў змянілася да непазнавальнасці. Аднак на еўрапейскай мапе свабодных і дэмакратычных краін дагэтуль нестае адной, Вашай Беларусі, прычым насуперак выразна праяўлянаму волевыяўленню соцень тысяч яе грамадзян. Мяне напаўняе захапленне, што нягледзячы на гэта Вы працягваеце ў выказванні сваіх памкненняў і рызыкуеце сваёй кар’ерай, свабодай і жыццём. Мяне гэта тым больш уражвае, што сваю прагу свабоды вы праяўляеце адной з найстарэйшых формаў, якой людзі праяўляюць свае жаданні і эмоцыі – праз карагод, танец. Аднак адначасова я адчуваю і фрустрацыю і смутак ад нядольнасці міжнароднай супольнасці, і асабліва еўрапейскіх краін, прадставіць Вам больш эфектыўную падтрымку і дапамогу. Персанальныя санкцыі, абвешчаныя супраць некаторых беларускіх чыноўнікаў, недастатковыя. Еўразвяз і яго членскія краіны маюць таксама эканамічныя і палітычныя інструменты, з дапамогай якіх могуць аказваць больш дзейсны націск дзеля сыходу дыктатара.

Аднак наконт будучыні Беларусі могуць урэшце прыняць рашэнне толькі яе ўласныя грамадзяне. Велізарная колькасць моладзі, якая ўдзельнічае ў пратэстах апошніх тыдняў, напаўняе мяне перакананнем, што гэта будзе будучыня свабодная і больш прыветная да жаданняў і прагненняў беларускага люду. Святлана Ціханоўская нядаўна ў адным з нашых дыялогаў у Бібліятэцы Вацлава Гаўла пра ролю правоў жанчын у сучасным свеце сказала: “У суровы свет палітыкі жанчыны могуць прынесці больш ласкавасці”. Я веру, што ў ажыццяўленні гэтай цудоўнай задачы, поспех якой быў бы на карысць нам усім, будзеце ўдзельнічаць і Вы.

З павагай і захапленнем

Ваш

Міхаэл Жантаўскі